ЦЭНТР НОВЫХ ІДЭЙ




# РЭАЛІЗАЦЫЯ ПАТЭНЦЫЯЛУ БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ:

## *ЯК ПАШЫРЫЦЬ ЯЕ ЎДЗЕЛ У ГРАМАДСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ?*

Вераніка Ерш, Максім Зафранскі,
Ліка Юр’ева, Алана Гебрэмарыям

Кейс-клуб 2024 | Good governance

# УСТУП

Нават у часы рэпрэсій у беларускай моладзі ёсць патэнцыял, імпэт і сілы прыўносіць змены ў грамадства. Гэтую энергію варта заўважыць і накіраваць у тыя сферы, дзе яна запатрабаваная. Цяпер патэнцыял моладзі рэалізуецца не напоўніцу.

Гэтым дакументам мы закладаем пачатак працы па ўключэнні моладзі ў грамадскія працэсы, а не даем гатовыя рашэнні праблем, якія неабходна дэталёва распрацоўваць ва ўмовах небяспекі і зменлівасці ў краіне.

# У ЯКІМ КАНТЭКСЦЕ ІСНУЕ БЕЛАРУСКАЯ МОЛАДЗЬ?

На 1-га студзеня 2023-га года ў Беларусі пражывала больш за 1,5 млн маладых людзей – 17,8% ад агульнай колькасці насельніцтва. Пры гэтым партрэт беларускай моладзі дастаткова неаднародны. Згодна з даследаваннем “Моладзевага блока”, ёй характэрныя розныя каштоўнасныя тэндэнцыі: прага задаволення сваіх патрэбаў, самастойнасці, асабістай свабоды і дасягнення поспеху.

Такую вялікую і дынамічную групу немагчыма ігнараваць пры стратэгічным планаванні дэмакратычных рэформ і павышэнні дабрабыту ў Беларусі. Важна пазначыць, што ў маштабах агульнанацыянальных выклікаў праблемы моладзі ўспрымаюцца грамадствам без значнай увагі. У Беларусі не створаны спрыяльны асяродак для матывацыі моладзі ў грамадскім удзеле. Праблемы моладзі не заўважаюцца грамадствам праз адсутнасць пляцоўкі для іх фармулявання, абмеркавання і вырашэння. Моладзь сутыкаецца з бар’ерамі праз прадузятасць часткі грамадства, якая звязаная са стэрэатыпамі наконт узросту, малога досведу і недастатковых ведаў. Амаль цалкам знішчаныя магчымасці для нефармальнай адукацыі і адсутнічае адукацыя, звязаная з грамадскай актыўнасцю.

Таму адна прыярытэтныя задачы – прааналізаваць стан беларускай моладзі, прапанаваць варыянты для бяспечнага ўдзелу моладзі ў грамадска-палітычных працэсах і выпрацаваць шляхі павышэння зацікаўленасці моладзі ўнутры Беларусі ў такім удзеле.

З улікам сітуацыі ў Беларусі мы не можам гаварыць пра ўдзел моладзі ў належным кіраванні ў класічным разуменні і разглядаем яго ў больш шырокім сэнсе праз бяспечную альтэрнатыву – грамадскі ўдзел. У гэтым аналітычным дакуменце пад грамадскім удзелам мы разумеем сукупнасць дзеянняў, накіраваных на тое, каб змяніць жыццё супольнасцяў і развіваць веды, навыкі, а таксама узмацняць каштоўнасці і матывацыю для дасягнення гэтых змен. Трэба таксама адзначыць, што мы факусуемся на беларускай моладзі ад 18 да 35 гадоў, якая жыве ў самой Беларусі.

# ЯК ПЕРААДОЛЕЦЬ БАР’ЕРЫ НА ШЛЯХУ МОЛАДЗІ?

Павысіць удзел моладзі ў вырашэнні праблем грамадства можна праз адукацыю, лакальныя супольнасці, блогерства, медыі і бізнес.

***Бяспечная адукацыя***

У фармальнай адукацыі становяцца ўсё больш відавочнымі праблемы ў галіне акадэмічных свабодаў. Гэта характэрна для беларускай і сусветнай акадэмічнай супольнасці, аднак Academic freedom index паставіў Беларусь на адну з самых нізкіх пазіцый. У беларускай сістэме адукацыі назіраецца цэнзура, пераслед іншадумства, адміністрацыйнае самавольства. У такіх умовах складана фармаваць бяспечную прастору для дыскусій, крытычнага мыслення моладзі. Сярод часткі моладзі гэта прыводзіць да пошукаў нефармальных магчымасцяў адукацыі ці праграм у еўрапейскіх ВНУ.

Аднак у выніку рэпрэсій, згодна з маніторынгам LawTrend, было закрыта больш за 20% НДА, а іншыя знаходзяцца ў працэсе роспуску. Вялікая колькасць з іх займалася нефармальнай адукацыяй. З крыміналізацыяй іх дзейнасці можна звязаць і **зніжэнне ў два разы** (з 24% у 2020-ым да 12% у 2022-ім годзе) **папулярнасці нефармальнай адукацыі як спосабу ўдзелу ў вырашэнні праблем**, што зафіксавана ў аналізе Беларускага нацыянальнага моладзевага савета “РАДА”. Унутры Беларусі амаль не застаецца даступных і бяспечных варыянтаў нефармальнай адукацыі. У такой сітуацыі павялічваецца запыт на анлайн-курсы.

***Удзел у мясцовых ініцыятывах***

На лакальным грамадскім узроўні ў 2020-ым годзе ў грамадстве, у тым ліку сярод моладзі, быў папулярны ўдзел у лакальных суполках: раённых актыўнасцях і чатах (канцэртах, лекцыях, прыбіранні тэрыторыі, чаяваннях). Але цяпер мы **назіраем адваротную тэндэнцыю**: звужэнне паняцця “грамадская актыўнасць”. Яно ўсё больш разумеецца толькі як грамадска-палітычная дзейнасць: напісанне петыцыяў і зваротаў, галасаванне на выбарах, удзел у грамадска-палітычных аб’яднаннях. Падчас палітычнага крызісу дзейнасць лакальных суполак і ініцыятыў **не ўспрымаецца сацыяльна важнай**, але ж менавіта яна закладае падмурак для фармавання самасвядомасці, назапашвання новых ведаў і навыкаў, падтрымлівае сувязі паміж людзьмі і стварае прастору для праявы салідарнасці. У апісаных палітычных умовах **для моладзі больш бяспечным ёсць удзел у лакальных аб’яднаннях грамадзян па інтарэсах**. Такія актыўнасці не павінны быць інстытуцыяналізаванымі, да таго ж парог уваходу ў гэтыя працэсы ніжэйшы, яны не патрабуюць прафесійных кампетэнцыяў і выдаткаў вялікай колькасці часу. У межах універсітэтаў такая актыўнасць з’яўляецца добрай заменай праўладных студсаюзаў, прафсаюзаў і БРСМ.

Таксама на гэтым узроўні з’яўляюцца актуальнымі валанцёрства і ўдзел у лакальных ініцыятывах: дапамога дзіцячым прытулкам, дамам састарэлых, людзям з інваліднасцю, добраўпарадкаванне тэрыторыі, дабрачынныя зборы сродкаў, аднаўленне гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Патэнцыял гэтага паказвае нядаўняе апытанне. На пытанне “Ці бралі вы ўдзел у аб’яднаннях […] у якасці валанцёра хаця б раз за апошні год?” 24% адказалі станоўча.

*Грамадска-палітычны ўдзел*

Што тычыцца грамадска-палітычнага ўдзелу, то паводле звестак вышэй згаданага аналізу ад “РАДА”, больш чым удвая скарацілася колькасць тых, хто ведае, што такое арганізацыі грамадзянскай супольнасці (у 2020-ым – 16%, у 2022-ім – 7%). Матывацыя моладзі для фармальнага ўключэння ў грамадскія арганізацыі падае, а кола магчымасцяў для актыўнай дзейнасці звужаецца. У такіх умовах бачыцца магчымым удзел моладзі ў падрыхтоўцы петыцыяў, зваротаў, непалітызаваных адвакацыйных кампаніях, арганізацыях дабрачынных акцый. Таксама варыянтам з’яўляецца далучэнне да старых і новых некамерцыйных арганізацый без афіляцыі з “экстрэмізмам”.

Існуюць і пэўныя складанасці *спажывання інфармацыі*. Шматлікія незалежныя СМІ прызнаныя “экстрэмісцкімі фармаваннямі”, таму праз іх складана дагрукацца да моладзі ўнутры краіны. Згодна з апытаннем Chatham House, траціна беларускай моладзі рэдка карыстаецца навінавымі СМІ, каля паловы не можа назваць блогераў і журналістаў, якія асвятляюць грамадска-палітычныя тэмы. У той жа час паводле вынікаў даследавання “Моладзевага блока”,  больш універсальнымі пляцоўкамі з’яўляюцца **Instagram і YouTube. TikTok** таксама папулярны сярод маладзейшай аўдыторыі (18-23 гады), якая прагне самаразвіцця і забаўляльнага кантэнту.

У апісаным кантэксце моладзь, згодна з даследаваннем Офіса еўрапейскай экспертызы і камунікацыі, бачыць **бар’еры і драйверы** для свайго ўдзелу ў грамадскіх ініцыятывах. Стымуламі адзначаюцца цікавыя праекты, супадзенне каштоўнасцяў, імкненне дапамагчы іншым і ясныя мэты арганізацый і ініцыятыў. Сярод бар’ераў – адсутнасць інфармацыі, як можна ўдзельнічаць, недастатковая актыўнасць арганізацый па пашырэнні кола ўдзельнікаў і недахоп часу.

# ШТО МЫ ПРАПАНОЎВАЕМ?

Апісаная праблематыка, стан беларускай моладзі, магчымыя ўзроўні яе ўдзелу ў грамадска-палітычных працэсах даюць падставы **выпрацаваць шэраг рэкамендацый**, як павялічыць грамадскі ўдзел моладзі. **Стэйкхолдарамі, да якіх скіраваныя варыянты вырашэння апісаных праблем, з'яўляюцца палітычныя актары, арганізацыі грамадзянскай супольнасці, прыватны сектар, медыі, блогеры**.

1. Арганізацыям грамадзянскай супольнасці і палітычным актарам варта **ствараць даступныя і інклюзіўныя платформы для ўдзелу і выказвання моладзі**. Тых, якія існуюць цяпер у Беларусі, недастаткова, часта – праз іх сімвалізм, а не рэальную спробу далучыць моладзь у працэсы. Таму мы прапаноўваем праводзіць у Беларусі разнастайныя фестывалі, летнікі і хакатоны па тэмах бізнесу і сацпрадпрымальніцтва (па прыкладу Social Weekend), культуры, адукацыі, экалогіі з удзелам прадстаўнікоў гэтых сфер, моладзі, ВНУ, дзейных НДА. Гэта магло б спрыяць дыялогу, аб'яднанню ў вырашэнні праблем.

2. Палітычным інстытутам і некамерцыйным арганізацыям мы раім шукаць новыя крыніцы і пашыраць **рэсурсную дапамогу моладзі** (праграмы фінансавай, псіхалагічнай і інфармацыйнай падтрымкі). Іншай крыніцай сродкаў мы бачым **супрацоўніцтва з прыватным сектарам**: з'яўленне **стыпендыі** для падтрымкі моладзі ўнутры Беларусі ад бізнесменаў, мецэнатаў, IT-кампаній (па прыкладзе стыпендыі імя Аркадзя Смоліча) для фінансавай падтрымкі моладзевых сацыяльных праектаў. Яшчэ адным прыкладам рэсурснай дапамогі могуць быць **конкурсы эсэ, праектаў з фінансавай падтрымкай для альтэрнатыўнай адукацыі** моладзі.

3. Медыям варта **спрыяць павелічэнню прысутнасці моладзі ў публічнай прасторы**. Гэта дапамагае дэманстрацыі добрых ролевых мадэляў, асвятленню актыўнасці моладзі і яе экспертнасці, а таксама дазваляе моладзі бачыць вынікі сваёй дзейнасці. Гэта могуць быць стажыроўкі ў рэгіянальных газетах; стварэнне тэматычных відэаэфіраў у TikTok, YouTube, рубрык з моладдзю на сайтах СМІ; дапамога моладзі ад СМІ ў рэкламе моладзевых блогаў на розных інтэрнэт-пляцоўках. Таксама ўключэнне моладзі магчыма і праз спецыялізаваны рэсурс Adu.place, дзе прадстаўленыя магчымасці ўдзелу моладзі праз фармальную і нефармальную адукацыю.

4. **НКА ўнутры Беларусі маюць распрацоўваць і праводзіць адукацыйныя анлайн-курсы для маладых людзей па журналістыцы, сторытэйлінгу і вядзенні моладзевых пляцовак-аналагаў СМІ**: "Тэлеграм"-каналы, самвыдатныя СМІ, блогі – з прыцягненнем топавых блогераў унутры краіны.

5. Моладзевыя лідары і лідаркі меркаванняў унутры Беларусі (блогеры ў YouTube, Instagram і TikTok) маглі б стаць **мостам для камунікацыі і асветы для моладзі** ўнутры і па-за краінай. Мы рэкамендуем блогерам заахвочваць моладзь праз рэалізацыю бяспечнай актыўнасці: сумесных пастоў, выпускаў шоу, эфіраў, відэа-рылсаў у межах тэматыкі свайго блога. Прыкладам такой дзейнасці можа быць відэа ад беларускіх блогераў пра дэбатныя клубы ва ўніверсітэтах і аповед, чаму ўмець дыскутаваць – гэта стылёва.

## АЎТАРЫ І АЎТАРКІ:



**Вераніка Ерш** – бакалаўрка права.



**Максім Зафранскі –** актывіст Задзіночання Беларускіх Студэнтаў, студэнт Нарвежскага ўніверсітэта навук аб навакольным асяроддзі і жыцці.



**Ліка Юр’ева** – журналістка.



**Алана Гебрэмарыям –** моладзевая актывістка, грамадска-палітычная дзеячка.

---

**Кейс-клуб** – гэта каманднае спаборніцтва маладых лідараў і лідарак за лепшы праект па вырашэнні сацыяльнага ці палітычнага выкліку.

ЦЭНТР НОВЫХ ІДЭЙ

**Цэнтр новых ідэй** – аналітычны цэнтр, дзейнасць якога прысвечаная магчымасцям развіцця і адказам на выклікі, якія стаяць перад Беларуссю ў XXI стагоддзі. Нашая місія ў тым, каб дапамагчы палітычным і грамадскім арганізацыям пабудаваць больш адкрытую, заможную і ўстойлівую Беларусь.

*www.newideas.center*

Фота: Віялета Саўчыц